**Грыцкевіч А.П.**, *прафесар*

# З ГІСТОРЫІ РАЗВІЦЦЯ КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIV — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст.

Пранікненне каталіцызму на Беларусь насіла ў XIII-XIV стст. спарадычны характар. Прыкладамі гэтага з'яўляюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хрышчэнне князя Міндоўга і яго літоўскай дружыны ў Наваградку ў 1251 г.(а ў 1260 г.яго апастазыя), з'яўленне каталікаў з Рыгі ў Полацку ў пачатку XIУ ст., зварот вялікага князя Гедыміна ў 1323 г. да манахаў, дамініканцаў і францысканцаў у Літву і Беларусь, з запрашэннем перасяляцца.

Пачатак шырокага пранікнення каталіцкай царквы на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага і Рускага (Беларуска-Літоўскай дзяржавы) адносіцца да перыяду пасля Крэўскай уніі 1385 г. У лютым 1387 г. вялікі князь літоўскі і кароль польскі Ягайла (Уладзіслаў II) сабраў у Вільні з'езд літоўскіх баяр, дзе тыя, былыя язычнікі, былі ахрышчаны каталіцкім духавенствам, якое прыехала разам з каралём з Польшчы.

17 лютага 1387 г. Ягайла выдаў прывілей новастворанаму Віленскаму каталіцкаму біскупству (епархіі) на зямельныя валоданні. Віленскае біскупства атрымала ў сваё касцёльнае падпарадкаванне амаль усю тэрыторыю Беларусі (за выключэннем Берасцейскай зямлі) і ўсходні акрайчык Літвы. Аднак спачатку на тэрыторыі біскупства было толькі 7 каталіцкіх парафій, з іх 3 на тэрыторыі Беларусі - у Крэве, Абольцах і Гайне, дзе захаваліся рэшткі аўтахтоннага літоўскага насельніцтва, якое было да хрышчэння язычнікам.

Але не ўсе прадстаўнікі літоўскай знаці, уключаючы братоў і родных Ягайлы, прынялі каталіцтва. Раней яны былі ахрышчаны паводле праваслаўнага абраду, як і Ягайла (Якаў), мелі маёнткі і ўдзелы на Беларусі і Украіне, успрынялі беларускую культуру і мову, былі звязаны палітычнымі інтарэсамі з мясцовым баярствам і ставіліся непрыхільна да каталіцызму.

Усяго да 1430 г. (канец панавання вялікага князя Вітаўта Вялікага) у Літве і на Беларусі было заснавана 27 парафіяльных касцёлаў, з іх на Беларусі - 12. Да канца XIV — першай трэці XV ст. адносяцца асноўныя акты дзяржаўнай улады, якімі стваралася прывілеяванае становішча каталіцкай царквы. Да 1440 г. каталіцкая царква мела маёнткі, у якіх налічвалася да 120 вёсак. У другой палове XV - першай палове XVI ст. яе зямельныя ўладанні пашырыліся яшчэ болей. У сярэдзіне XVI ст. Віленскае біскупства мела ўжо маёнткі з агульнай лічбай 285 вёсак і 16

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

мястэчак з насельніцтвам каля 40 тысяч чалавек. Дзве трэціх гэтых маёнткаў былі на беларускай тэрыторыі.

Амаль за два стагоддзі каталіцкая царква пашырыла свой уплыў на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Усяго за 1387-1550 гг. на тэрыторыі біскупства было заснавана 259 парафій, з іх на беларускай тэрыторыі - 93. Аднак на ўсходзе Беларусі касцёлаў амаль не было зусім. Там па-ранейшаму панавала праваслаўная царква. Так, па адной толькі парафіі было ў Аршанскім і Віцебскім паветах ды ў Полацкім ваяводстве. Асноўная сетка каталіцкіх парафій даходзіла з захаду да лініі Іказнь-Будуслаў-Гарадзішча-Нясвіж-Пінск. На ўсход ад гэтай лініі былі толькі адзінкавыя касцёлы (Менск, Слуцк, Полацк, Віцебск). Такім чынам, да сярэдзіны ХУ1 ст. каталіцкая царква асвойвала літоўскія землі і тую частку зямель Беларусі, якая была блізкай да сталіцы дзяржавы. Ва ўсходніх раёнах Беларусі (Магілёў, Мсціслаў, Орша) касцёлаў увогуле не было да пачатку XVII ст.

Але і ў заходніх землях Беларусі працэс будаўніцтва касцёлаў і кляштараў ішоў паралельна з заснаваннем новых праваслаўных цэркваў і манастыроў.

Каталіцкая царква ў канцы XIV - першай трэці XV ст. заняла пераважнае палітычнае становішча ў дзяржаве. Каталіцкія біскупы (іх было 4) займалі месца ў панах-радзе, вышэйшым кіраўнічым органе Беларуска-Літоўскай дзяржавы.

Роля каталіцкай царквы выразна праяўляецца ў развіцці культуры Беларусі і Літвы. Каталіцкая царква несла элементы заходнееўрапейскай культуры, распаўсюджванне якой адыгрывала ролю ў развіцці грамадска-палітычнай думкі, касцёльнага і абароннага дойлідства, музыкі, асветы, навуковых ведаў. Частка моладзі пачала з цягам часу вучыцца ў замежных вышэйшых навучальных установах, у тым ліку ў Кракаўскім і Пражскім універсітэтах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ